Гэтыя тэндэнцыі сведчаць пра пошукі новых магчымасцей дзейнасці мастака ў грамадстве, якія базіруюцца на дыялектыцы адзінства сінкрэтычнасці і секулярнасці ў працэсе фарміравання творчай асобы.

**І.А.Алексніна,**
*кандыдат мастацтвазнаўства*

## РОЛЯ ПАРАТЭАТРАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ ЗАХОДНЯГА ПААЗЕР'Я Ў ФАРМІРАВАННІ ДУХОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускі народ на працягу тысячагоддзяў ствараў свае ўяўленні пра нормы паводзін, мараль і этыкет, перадаваў іх з пакалення ў пакаленне. Гэта стала асновай для фарміравання і развіцця духоўнай культуры беларусаў: любоў да роднай зямлі-карміцелькі і бацькоўскай спадчыны, павага да старэйшых, клопат аб малодшых, добразычлівасць, ветлівасць, бескарыслівасць, гасціннасць, цярплівасць, сціпласць, працавітасць, кемлівасць, гаспадарлівасць, калектывізм, узаемадапамога, памяркоўнасць, сумленнасць, праўдзівасць, дабрыня. Агіднымі рысамі чалавечага характару лічыліся гультайства, няўмельства, лянота, п'янства, дармаедства і інш.

Існавала таксама своеасаблівая сямейна-бытавая мараль (пошук партнёраў "роўнага гонару", узаемнае каханне маладых, пачуццё адказнасці за стварэнне сям'і, выхаванне дзяцей і інш.). Эстэтычнай ацэнкай якасцей чалавека былі яго адносіны да працы, з якой звязаны ўяўленні аб прыгажосці. Беларусы распрацавалі і своеасаблівую народную эстэтыку, асноўным для якой было выхаванне пачуццяў прыгожага, узвышанага, мастацкага густу.

Выключнае значэнне ў развіцці традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў мелі народныя звычаі і абрады (сямейна-бытавыя і каляндарныя) і звязаныя з імі паратэатральныя дзействы. Раней тэрмін "паратэатральная культура" выкарыстоўваўся ў дачыненні да шляхецкай тэатральнай культуры XVIII ст. [1]. Аднак у сучасным тэатразнаўстве пад гэтым тэрмінам разумеюцца і тыя мастацкія з'явы культуры, якія нараджаюцца на мяжы рэчаіснасці і мастацтва, насычаны тэатральнымі элементамі. Да іх адносяцца некаторыя сямейна-бытавыя абрады, каляндарныя святкаванні карнавальнага тыпу з пераапрананнем, калядаваннем, валачобніцтвам, святочныя ігрышчы тыпу "Жаніцьба Цярэшкі", парадыйныя сцэнкі пераапранутых і інш. У тых мясцовасцях Беларусі, дзе для насельніцтва быў характэрны даволі ізаляваны лад жыцця, яны захаваліся да другой паловы XX ст. Паратэатральная культура служыла простаму селяніну не толькі для выяўлення падсвядомага "тэатральнага" інстынкту, садзейнічала актыўнаму адпачынку, але і адыгрывала важную ролю ў жыцці чалавека і маральна-эстэтычным выхаванні яго асобы.

У склад Заходняга Паазер'я (Падзвіння), паратэатральная культура жыхароў якога разглядаецца, уваходзяць тэрыторыі шасці сучасных раёнаў Віцебскай вобласці: Докшыцкага, Пастаўскага, Глыбоцкага, Шаркоўшчынскага, Браслаўскага і Міёрскага. Паратэатральная культура на гэтых землях развівалася ва ўмовах адсутнасці значных па эканоміка-культурным ўздзеянні гарадоў, на памежжы з Латвіяй і Літвой, пад уплывам пераважна аграрнага роду заняткаў і местачкова-хутарскога ладу жыцця. У запісах тэатральнага фальклору XX ст. знайшлі адбітак і рэлігійны светапогляд творцаў з народа (праваслаўных і каталікоў), і супрацьстаянне прадстаўнікоў польскай і беларускай культур у 20 – 30-я гг. XX ст. Тут нарадзіліся і захаваліся да першай паловы XX ст. цікавыя тыпы святкаванняў карнавальнага тыпу ("Тры

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

каралі”, лалоўніцтва, ігрышчы “Яшчар”, “Жаніцьба Цярэшкі”), сфарміраваліся унікальныя мастацкія традыцыі ў народнай драматычнай творчасці, у якіх перамежаваны і язычніцкія погляды беларусаў, і здабыткі фальклорна-тэатральнага выканання, і хрысціянская мараль.

У радзінным абрадзе, прысвечаным прыняццю нованароджанага ў сям’ю і грамадства, адзначаецца сувязь са старажытнабеларускімі (і агульнаславянскімі) рытуальна-абрадавымі магічнымі дзеяннямі. Драматургія абраду ўяўляла чатыры асноўныя этапы: выпраўленне ў царкву (касцёл) для хрышчэння; абрад хрышчэння; сустрэча пасля яго і святочнае застолле, насычанае шматлікімі абрадавымі магічна-засцерагальнымі дзеяннямі, накіраванымі на фізічнае і духоўнае здароў’е немаўляці, багатае песнямі і тэатралізацыяй. Галоўнымі дзеючымі асобамі свята былі бабка-павітуха і кум з кумой. Да нараджэння дзіцяці клопат пра будучую маці і немаўлятка ляжаў на плячах бабкі-павітухі (звычайна сталая жанчына, якая валодала прыёмамі народнай медыцыны, выконвала акушэрскія функцыі, што спалучаліся з прыёмамі імітацыйнай і кантактнай магіі). Пасля хрышчэння не менш важную ролю ў жыцці нованароджанага ігралі кумы, якія па сутнасці лічыліся другімі бацькамі. Адносна свайго хросніка яны доўгі час выконвалі патранажныя функцыі. Важную ролю пры падборы прэтэндэнтаў мела не толькі сваяцтва, улічваліся і чалавечыя якасці “бабкі” і кумоў, іх артыстызм і здольнасць да імправізацыі. Нараджэнне чалавека – гэта вялікае свята не толькі для сям’і, але і для ўсёй вёскі, таму святочнае застолле заканчвалася імкненнем прысутных на хрэсьбінах уключыць як можна большую колькасць людзей у святкаванне. Гэтай мэце служылі дзеянні хрэсьбінных пераапранутых [2].

Прыкладам сямейна-бытавога свята з’яўляецца таксама традыцыйнае беларускае вяселле. Шлюб у кожнага народа ўспрымаецца як факт пераходу чалавека ад дзяцінства да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сталасці, і права на гэты пераход трэба пацвердзіць у прысутнасці ўсяго роду. Сцэнарый вяселля па кампазіцыйнай пабудове (завязка – кульмінацыя – развязка) блізкі да драматургічнага твора. У ім замацоўваюцца і перадаюцца з пакалення ў пакаленне ўяўленні пра асновы сямейна-бытавой маралі, таму гэты абрад насычаны глыбокім псіхалагізмам, сімвалізмам, традыцыйнымі рытуальнымі дзеяннямі. Грамада, якая, акрамя бацькоў, маладых, сватоў і кумоў, прымала актыўны ўдзел у вяселлі, сваімі падарункамі, пажаданнямі, спевамі, жартамі, гульнямі сімвалічна пацвярджала прызнанне і прыняцце маладой сям'і ў мікрасоцыум. На вяселлі гучалі парады і пажаданні багатага і шчаслівага жыцця маладой пары, павагі адзін да аднаго, годных адносін да бацькоў і будучых дзяцей. Вяселле, такім чынам, было своеасаблівым "інстытутам маладой сям'і". З гэтага часу новая пара адчувала свае абавязкі не толькі перад Богам, але і перад роднымі і аднавяскоўцамі [5; 6].

Менавіта грамада рэгулявала стварэнне сямейных пар. У некаторых паселішчах (в. Заборнікі і Мурмішкі Браслаўскага раёна) на масленічным тыдні адбываліся жартаўліва-іранічныя "пакаранні" нежанатых маладых людзей, якія дасягнулі шлюбнага ўзросту, але не стварылі сям'і. Удзельнікі гульні ездзілі па вёсцы на спецыяльна ўпрыгожаных вазках. Калі ім трапляўся нежанаты хлопец, на шыю яму чаплялі "калодку" і пыталі, па якой прычыне той не жаніўся, пасля чаго патрабавалі выкуп (матэрыяльны або творчы). Дзяўчыне спецыяльна рыхтавалі падушку з сена, саджалі на вазок і вазілі па вёсцы, паэтызуючы яе чалавечыя якасці, гаспадарлівасць і прыгажосць.

На ўслаўленне сямейнага дабрабыту быў накіраваны і валачобны абрад, які захаваўся да 1930-х гг. на тэрыторыі Заходняга Паазер'я ў "жывым бытаванні". У язычніцкія часы валачобніцтва мела магічна-рытуальны сэнс, было накіравана на павышэнне ўрадлівасці, ушанаванне, услаўленне "гаспадарка – добрага панка", яго працавітасці, шчодрасці,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гасціннасці. Пад уздзеяннем праваслаўнага і каталіцкага веравызнання ў заходняй Віцебшчыне абрад не толькі пашыраецца, але і набывае новыя назвы: "лалоўніцтва" (в. Стаўрава Браслаўскага раёна; в. Васіліны, Лынтупы Пастаўскага раёна; в.Малыя Алашкі Міёрскага раёна), "хаджэнне ў алялюю" (в. Магуны Пастаўскага раёна) і "хрыстосніцтва" (в. Бабышкі, Латышы, Лявонполле Міёрскага раёна). У песнях славяць Бога, Багародзіцу, Хрыста, пералічваюць шэраг святцаў і прысвяткаў, ухваляюць гаспадара і гаспадыню, іх шчырую працу, "дварок-раёк", жадаюць здароў'я і дабрабыту, а калі дзеці дасягаюць шлюбнага ўзросту, для іх спяваюцца спецыяльна прызначаныя песні. Тэксты валачобных песень, хаця і маюць традыцыйную аснову, вар'іруюцца ў залежнасці ад складу слухачоў [3].

Значнае пашырэнне на адзначанай тэрыторыі ў канцы XIX – пачатку XX ст. атрымалі абходы вёсак калядоўшчыкамі-звяздарамі. Першапачаткова (прыкладна да XVII ст.) гэта было абавязковым зімовым рытуалам, які выконвалі мясцовыя святары. Звяздарства суправаджалася маленнямі, чытаннем духоўных вершаў і віншаваннямі вернікаў з нараджэннем Хрыста. Пад уплывам каталіцкага і праваслаўнага веравызнання хаджэнне "звездароў" было апаэтызавана. Ва ўсіх мясцовасцях Падзвіння асаблівай павагай карысталася зорка. Як толькі калядны гурт уваходзіў у хату, "звяздар" станавіўся ў чырвоны кут, пад ікону, і ўвесь час, пакуль іншыя ўдзельнікі гурту разыгрывалі прадстаўленне і спявалі віншавальныя песні, павінен быў знаходзіцца там. Тэксты песень і віншаванняў выконваліся пераважна на польскай мове [4].

У некаторых мясцовасцях Заходняга Паазер'я (напрыклад, у в. Германавічы Шаркоўшчынскага раёна) назіраецца ўплыў веравызнання на творчасць народа, што прывяло да трансфармацыі рэлігійнага абраду ў своеасаблівае тэатралізаванае відовішча. У калядным гурце

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

в. Германавічы ўдзельнічалі асобы, не характэрныя для іншых рэгіёнаў Беларусі. Гэта "анёл", якога прадстаўляла дзяўчынка ў белай вопратцы з крыламі з гафрыраванай паперы і "каронай" на галаве. Другая асоба – "чорт", на ролю якога падбіралі рухавага, гарэзлівага хлопца. Наступны персанаж калядавання – "Божая маці" з немаўляткам на руках, якое сімвалізавала Ісуса Хрыста. Завяршалі гэту працэсію "кароль" і калядны "дзед", якога яшчэ называлі "дзедам-марозам". "Караля", звычайна яго выконваў мужчына сярэдніх гадоў, апраналі адпаведным чынам. Выканаўца ролі "дзеда" імкнуўся дасягнуць знешняга падабенства шляхам пераапранання і своеасаблівых паводзін. Зааморфныя пераапрананні, нават "у казу", для гэтага гурту не характэрныя. Спецыяльных песень калядоўшчыкі не спявалі. Звышзадача абходу аднавяскоўцаў заключалася ў тым, каб павітаць гаспадароў і іх сем'і, павіншаваць са святам нараджэння Хрыста, пажадаць здароў'я і дабрабыту.

Яшчэ адным тыпам каляднага вандравання, якое мела пэўныя адрозненні ад падобных вандраванняў у Цэнтральнай і Усходняй Беларусі, быў абрад хаджэння "Тры каралі" на каталіцкае свята "Тшы крулі" (7 студзеня). Гэты абрад характэрны для населеных пунктаў, дзе пераважную большасць складалі каталікі. Найбольш цікавыя варыянты зафіксаваны на Пастаўшчыне і часткова Браслаўшчыне, дзе, акрамя "каралёў", у гурце ўдзельнічалі і іншыя персанажы: "анёл", "чорт", "пастушкі". Напрыклад, у в.Лынтупы збіраліся 6 – 7 хлопцаў, якія бралі дазвол на хаджэнне па сваёй парафіі, і рыхтаваліся да абходу вёсак. Прынцып пераапранання быў наступным: на галаве ў кожнага "караля" высокая бліскучая шапка, падобная на шалом, вопратка – вышываная, упрыгожаная накшталт адзення ксяндзоў ("комжы"). У руках "каралі" трымалі доўгія палкі, якія нагадвалі посахі. На шаломах і посахах замацоўваліся выразаныя і размаляваныя фігуркі каралёў. "Каралі", "анёл" і "пастушкі" паводзілі сябе згодна рэлігійнай традыцыі, ад іх



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

патрабаваліся адпаведныя знешнія даныя, валоданне голасам і пластыкай. Для выканання ролі "чорта" выбіралі жвавага, артыстычнага хлопца. Яго апраналі ў чорнае адзенне або вывернуты кажух, вымазвалі твар сажай, прычаплялі рогі, бараду, хвост, у які з мэтай абароны ад дзяцей тыкалі шпількі. Ён паводзіў сябе адпаведна вобразу: пужаў дзяцей, заляцаўся да гаспадынь, "спакушаў" іх.

Прыклады святкавання хрэсьбін, вяселля, валачобніцтва і калядавання даюць падставу адзначыць выключную ролю паратэатральных з'яў у фарміраванні і развіцці духоўных каштоўнасцей насельніцтва Заходняга Паазер'я. З аднога боку, у сямейна-бытавой і святочна-каляндарнай традыцыі замацоўваліся адвечныя маральныя каштоўнасці народа, з другога – менавіта праз гульнявую, відовішчную прыроду адбываліся пераасэнсаванне і засваенне беларускім селянінам духоўных каштоўнасцей хрысціянства.

---


1. *Барышев Г.И.* Театральная культура Белоруссии ХУIII века. – Мн.: Наука и техника, 1992. – 293 с.:ил.

2. *Кухаронак Т.* Радзінныя звычаі і абрады на Беларусі ў канцы XIX – XX ст. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.

3. *Панізнік С.* Масці кладку, заві ў хатку // Сцяг працы. – 1992. – 25 крас. – С. 3.

4. *Сысоў У.М.* З крыніц спрадвечных. – Мн.: Вышэйш. шк., 1997. – 415 с.

5. *Традыцыйныя* вяселлі Віцебшчыны (у сучасных запісах): Метад. дапам. / Пад рэд. В.Д.Ліцвінкі. – Мн.: Бел ІПК, 1988. – 134 с.

6. *Цвірка К.А.* Беларускае традыцыйнае вяселле // Вяселле: абрад. – Мн.: Навука і тэхніка, 1978. – С. 5 – 34.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ